САМ ТЫ МАСТАК!

(старонка будучых пісьменнікаў ды ілюстратараў)

НЯЗВЫКЛАЯ КАЗКА. **Паводле Дж.Радары.**

- Некалі жыла-была дзяўчынка, і звалі яе Жоўты Каптурок...
- Не, Чырвоны!
- А, сапраўды, Чырвоны Каптурок. Аднойчы маці кліча яе дый кажа: “Паслухай, Зялёны Каптурок...”
- Ды не, Чырвоны!
- Ну, згода, Чырвоны. Ідзі да цёткі Марусі, занясі ёй бульбяныя лупіны...
- Не тое! Ідзі да бабулі, занясі ёй пшанічны каравай!
- Добра ўжо. Дзяўчынка пайшла лесам, а насустрач ёй — жырафа...
- Ты блытаеш! Ёй сустрэўся воўк, а не жырафа!
- І воўк пытае ў яе: “Колькі будзе шэсць ды восем?”
- А вось і не! Воўк спытаў: “Куды ты ідзеш, Чырвоны Каптурок?”
- Твая рацыя. А Чорны Каптурок і кажа...
- Гэта быў Чырвоны Каптурок. Чырвоны! Чыр! Во! Ны!
- Ну але. Вось яна і адказвае: “Іду на кірмаш па таматную пасту!”
- Ды не было такога! “Я іду да хворай бабулі, але крыху заблукала!”
- Слушна. А кабыла і кажа...
- Якая кабыла? Гэта быў воўк.
- Натуральна! Воўк ёй кажа: “Сядай на пяты трамвай, даедзеш да Плошчы Перамогі...
- Не, дзядуля, не ўмееш ты казкі распавядаць!

!!!

“Заблытайце” любімую казку. Намалюйце ілюстрацыі!

Хаатычная, неперыядычная, моўна-лінгвістычная газетка для маладых беларусаў і іхных шчырых сяброў. Рэкамендавана ўсім, хто не баіцца вучыцца.

ЧОРНАЯ ШУФЛЯДКА

АСЦЯРОЖНА: чытаючы гэтае выданне, вы можаце выпадкова набрацца беларускіх слоў ды выразаў, заразіцца любоўю да Беларусі, у цяжкіх выпадках - засвоіць беларускую мову.

“TRILLER-PLACATE”

МІНСК, 2019

МОВА НАНОВА ДЗЕТКАМ БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

ЧОРНАЯ ШУФЛЯДКА.

Былі такія часы на нашай зямлі, калі беларусы штодня і паўсюль гаварылі па-беларуску…

Галоўнымі колерамі беларусы лічылі чорны, белы ды чырвоны. Менавіта таму традыцыйная беларуская вышыванка—гэта белая кашуля з чорнай і чырвонай вышыўкай. Кожны колер меў свой сэнс і значэнне.

Чорны колер быў звязаны з цёмнымі сіламі падземнага свету. Лічылася, што, калі чалавек апранецца ў чорнае, то цёмныя сілы прымуць яго за свайго і не стануць чапаць.

Белы колер—супрацьлегласць чорнаму—быў звязаны з нябёсным светам, святлом, плоднасцю. Белы колер сімвалізаваў уладу, напрыклад, белы воўк лічыўся царом над усімі ваўкамі.

Чырвоны—колер агню, колер крыві—таксама супрацьлеглы чорнаму. Чырвоны колер надае моцы, засцерагае ад хваробы. Нітка альбо стужка чырвонага колеру аберагае ад злых і зайздрослівых людзей.

ЖАРТАЧКІ!

- Прывітанне. Як справы ў школе?
- Добра!
- Пакажы дзённік!
- Няма чаго глядзець, там усяго адна двойка!
- Усяго адна?!
- Ды не хвалюйся так! Заўтра яшчэ прынясу!

- Прывітанне, тата!
- Прывітанне! Як поспехі?
- Тата, а слабо табе распісацца з заплюшчанымі вачыма?
- Распісацца?
- Ага!
- З заплюшчанымі вачыма.
- Вось-вось!
- Без праблем!
- Тады зрабі гэта ў маім дзённіку.

- Ізноў два! Ну што трэба зрабіць, каб ты перастаў прыносіць двойкі?
- Пагавары з настаўніцай, хай перастане выклікаць мяне да дошкі!

Дзякуй тым, хто выкладвае ў інтэрнэт прыдатныя малюнкі! Калі вы пабачылі свой малюнак ці фота ў нашым выданні—віншую, вы — наш пазаштатны супрацоўнік! Калі вам удасцца данесці да нас сваю нязгоду, мы выбачымся. Чэсна-чэсна.

МОВА НАНОВА
ДЗЕТКАМ
БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Ёсць рэчы, якія ад пачатку і да канца аднаго колеру. А ёсць такія, што мяняюць колер. Здагадайцеся, пра што гаворка.

1.Уночы ён – зялёны кулачок. Удзень – раскрые жоўты парасон. А потым ператворыцца ў белы шар.

Д з ь _ _ _ _ _ _ _

2.Перапранаецца двойчы на год. Летняе футра лягчэйшае, шэрае, зимовае футра цяплейшае, белае.

_ _ _ _

3.Колеры мяняе пастаянна: можа быць чорным и белым, синим и шэрым, блакитным и ружовым, аранжавым и залатым. Хто яго разумее, той ведае, якое будзе надворъе.

_ _ _ _

4. Маленькія зеляненькя, а большыя бываюць і зялёныя, і чырвоныя, і жоўтыя, і аранжавыя, і нават фіялетавыя.

_ _ _ _ _

Іншыя колеры таксама мелі сваё значэнне. Зялёны—колер новага жыцця, абуджэння прыроды. Існавала традыцыя, якая забараняла спяваць «вяснянкі» - веснавыя абрадныя песні - «на голы лес», гэта значыць, да таго, калі з'явіцца першая зеляніна.

Жоўты колер звязвалі як з сонцам, жыццём, так і з хваробамі. Хвораму прыносілі жоўтую хустку, каб гядзеў на яе і хутчэй адужваў. Дзецям абціралі шчокі залатой манетай, каб прайшла жаўтуха.

Сіні колер быў блізкі да чорнага. Сіні—колер мора, адкуль маглі з'яўляцца розныя пачвары ды страшыдлы. Сіні—гэта колер сінякоў і трупных плям, таму ён, як і чорны, звязваўся са смерцю. Чорт—аматар сіняй вопраткі. Сінім агнём свецяцца зачараваныя скарбы.

Шэры колер займае месца між белым і чорным, між святлом ды цемрай, між днём ды ноччу. Шэры колер звязвае свет людзей і падземны свет. Казачны памочнік—шэры воўк—дапамагае герою спраўляцца з чараўніцтвам, пераносіць яго са свету мёртвых у свет жывых ці наадварот. Ёсць і іншыя сівыя ці шэрыя памочнікі: конь, воран, сівы дзед.

(паводле кнігі «Міфалогія Беларусі»)

МОВА НАНОВА
ДЗЕТКАМ
БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Прачытайце верш “Братаў сакрэт”. Запішыце назвы колераў, пра якія ідзе гаворка.

Мне брат тры фарбы падарыў.
Я думаў, ён з мяне пакпіў.
Але мне брат адкрыў сакрэт:
У тых трох фарбах – цэлы свет!
Чырвоны колер – гэта мак,
І боршч (бо ў тым баршчы бурак),
І вышыўка на ручніках,
І нашай волі годны сцяг. _____
У чырвань жоўтага дадам –
І пасміхнецца сонца нам,
З вулкана лава пабяжыць,
Агонь у печы затрашчыць. _____
Малюю жоўтыя пяскі,
Над жытам кружаць матылькі,
Ляжыць на сподачку лімон,
І жоўты ліст губляе клён. _____
У жоўты сіні падмяшаць –
І можна траўку маляваць,
Вось кракадзіл і агурок,
І жабка скача за парог. _____
Блакіт нябёс, блакіт ільноў,
Блакіт азёр і ручаёў, _____
І мора сіняга ярчэй
Валошкаў сінь ды сінь вачэй. _____
А ў сіні чырвані дадаць –
І хмары ў небе паляцяць,
Фіялкі ўпрыгожаць лес,
І расцвіце ля плота бэз. _____
Запомніў братаў я сакрэт:
Тры фарбы – гэта цэлы свет!

Якія яшчэ колеры вы ведаеце? _____
_____
_____
_____

Паўтарыце эксперымент па змешванні колераў.

У слове КОЛЕРЫ расфарбуй кожную літару адпаведным колерам.

	Ч	Б	Б		Ч
К	О	Л	Е	Р	Ы
А	Р	А	Л	У	Р
Р	Н	К	Ы	Ж	В
Ы	Ы	І		О	О
Ч		Т		В	Н
Н		Н		Ы	Ы
Е		Ы			
В					
Ы					

??ШТО ЗНАЧАЦЬ ГЭТЫЯ ВЫСЛОЎІ?

Аж спіна пачырванела .

Сіні як пуп гусіны

Золата і на сметніку відаць

Перастане, як сарока белай стане

МОВА НАНОВА
ДЗЕТКАМ
БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Данік і Данута малявалі. Данута штурхнула Даніка пад руку, і ён перакуліў шклянку з вадой. Вада намачыла малюнак, фарбы перамяшаліся. Прыбярыце лішнія літары, каб “ачысціць” колеры.

ЧОЦРКНЫБЖУОЎБТЫ

ЧЫМРВАОНДЫБІЛАКНІТНЫ

ЎЗЯЛЮЁНЫХСЫРЭБЯНЫ

СІЮНІЭШТЭРЫЗБАЛРВОФВЫ

КАДРЫЦЧНЕРВЫБЭЗПАВЫГ

РБЕОЛЫРУВЖОЙВЫ

??

Расстаўце па парадку назвы месяцаў, пачынаючы са студзеня.

ЖНІВЕНЬ ЛЮТЫ ЛІСТАПАД ЛІПЕНЬ ЧЭРВЕНЬ САКАВІК СТУДЗЕНЬ СНЕЖАНЬ

КРАСАВІК КАСТРЫЧНІК ТРАВЕНЬ (МАЙ) ВЕРАСЕНЬ

РОБІМ РЭБУСЫ.

САКРЭТ ДРУГІ: МЯНЯЕМ ЛІТАРЫ МЕСЦАМІ.

Бываюць словы, якія адрозніваюцца толькі парадкам літар. Тады на дапамогу нам прыходзяць лічбы. Каб не памыліцца, дзейнічаць найлепей так:

1.Напішыце слова-падказку і пранумеруйце літары па парадку.

М А Р А К
1 2 3 4 5

2.Ніжэй напішыце слова, якое хочаце зашыфраваць. Падпішыце пад кожнай літарай другога слова нумар, які яна мела у першым слове.

К Р А М А
5 3 2 1 4

5,3,2,1,4

3.Падбярыце карцінку, якім заменіце слова -падказку, пад карцінкай запішыце лічбы у парадку, якога патрабуе загаданае слова.

Рэбус гатовы!

??

Прачытайце рэбусы:

3,2,1 _____

3,2,1,4 _____

2. Складзіце для сяброў рэбусы са слоў

КАМАР, РАНА, СОКАЛ.

МОВА НАНОВА
ДЗЕТКАМ
БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Як вядома, колеры існуюць не самі па сабе: колеры ёсць там, дзе ёсць вочы. Пазнаваць колеры і абрысы ўсяго вакол нас — супольная праца вачэй і мозга. Прачытайце казку пра вочы, а на с.11 мы з вамі пагаворым пра тое, як пабудаванае вока і як яно працуе.

ЯК ДВА БРАТА Ў РОЗНЫЯ БАКІ ГЛЯДЗЕЛІ.

Жылі-былі на твары вочы. Сядзелі ў вачніцах абапал носа і з цікаўнасцю пазіралі на свет. Але аднойчы ў левае вока заляцела мошка. Замірґала вока, заплакала. Мошку слязой змыла, але тая паспела крыху воку пашкодзіць. Захварэла левае вока. Чырвонае стала, слязлівае. На свет белы пазіраць адмаўляецца, за павекамі хаваецца. Праваму воку сумна адному. Адно вока бачыць не так, як два: не можа мозг вызначыць трапна адлегласць паміж рэчамі. Рука мяч кідае – мяч міма ляціць. Рука хоча нітку ў іголку заправіць – доўга возіцца, пакуль патрапіць.

Стала правае вока на левае наракаць. Маўляў, усё ты лайдачыш. Пакрыўдзілася левае вока.

– Буду ў свой бок глядзець. А правае хай у свой бок глядзіць.

І сталі вочы касавурыць у розныя бакі. Бедная галава зусім заблыталася: усё ў мозга дваіцца, кожнае вока сваю карцінку перадае. І чалавек то дрэва перад носам не заўважыць ды гуз наб'е, то шклянку са стала скіне – бяда!

Добра, што ішоў міма чараўнік, паглядзеў, як чалавек мучаецца, дый кажа:

– Вока, а вока, хочаш, пакажу нешта? – і выцягнуў з кішэні нешта бліскучае. Левае вока думае: "Мяне клічуць!" І правае вока так думае. Утаропіліся абодва вокі на бліскучы каменьчык, забыліся, што сварыліся. А чараўнік марудна так каменьчык паварочвае, крыху ўправа адвядзе, крыху ўлева, то наблізіць да вачэй, то аддаліць. Любуюцца вочы рознакаляровым каменьчыкам, з усіх бакоў разглядаюць, разам працуюць.

– Прыгожа? – пытаецца чараўнік.

– Прыгожа,- адказваюць вочы і галава.

– Калі будзеце дружна працаваць, дык усё наўкол правільна ўбачыце і гузоў на галаве набіваць не будзеце.

(канец)

ПАБУДОВА ВОКА.

Калі б ты захацеў зрабіць мадэль вока, табе спатрэбіліся б некалькі павялічальных шкельцаў, некалькі тоўстых гумак, круглы мяч з дзіркай, металёвая сетка і электрычны дрот. Круглы мяч з дзіркай – гэта абалонка вока (склера) і зрэнка - акенца, праз якое мы і бачым; на святле адтуліна зрэнкі звужаецца, прапускае толькі вузкі пучок яркіх промняў – мозг успрымае ўсё чотка і ясна. Сцямнела вакол – зрэнка пашыраецца, каб прапускаць болей промняў. Але промні ў прыцемках слабыя, таму мозг бачыць толькі абрысы рэчаў, без колераў і дробных дэталяў.

Павялічальных шкельцаў у воку некалькі.
Тоненькая рагавіца прыкрывае акенца зрэнкі. Хрусталік ловіць промні, што патрапілі ў зрэнку, і збірае ў пучок. За хрусталікам – трэцяя лінза: шклопадобнае цела. А ззаду гэтай апошняй лінзы – тоненькая сеткавіца, сетачка, сатканая з клетак-фотарэцэптараў (палачак ды колбачак). Палачкі ловяць святло, колбачкі – святло асобных колераў. І кожная клетка-рэцэптар падае электрычны сігнал у мозг. Усе сігналы з сеткавіцы збіраюцца ў адзін электрычны дрот – зрокавы нерв. Па ім трапляюць у мозг, а ўжо мозг разумее, што мы бачым.

А дзеля чаго ж нашай мадэлі гумкі? Гумкі – гэта цягліцы, на якіх вісіць мяч-вока. Гэтыя цягліцы паварочваюць вока, каб зрэнка лавіла промні з розных бакоў, а яшчэ яны крыху расцягваюць і сціскаюць вока-мячык, мяняючы форму лінзаў – і вока перастройваецца, каб лепей бачыць зблізу ці здалёк – настройвае рэзкасць. Калі цягліцы вачэй перанапружаныя, лінза перакошваецца, і вока кепска бачыць. А калі раптам хаця адна цягліца аднаго вока не дапрацоўвае – вока пачынае касавурыць, вочы перастаюць працаваць разам, зусім як у нашай гісторыі. Трэба кожны дзень трэніраваць цягліцы вачэй адмысловай гімнастыкай, і зрок захаваецца вострым.

МОВА НАНОВА
ДЗЕТКАМ
БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Запішыце колеры. Карыстайцеся падказкамі – словамі-асацыяцыямі. 10

1. Перліна. Мантыя. Ружа. Бэз. Апельсін. Фіялка.
2. Цемра. Рубель. Траўка. Кроў. Неба. Тое, што і карычневы.
3. Кіт. Свет. Мыш. Лімон. Пярсцёнак.

	м	а	ц	і	ц	О	ВЫ
1.							
						А	

2.						НЫ
Б					Т	
	р	у	н	а		

				і	
3.					Ы
				Т	

Запоўніце крыжаванку назвамі колераў. 7

К	О	Л	Е	Р	Ы

Падказка с.13

ЧЫСТАГАВОРКІ

У чмяля джала, і ў пчалы джала.

Чмель пчалу паважаў, пчала чмяля паважала.

Шпак шпаку пашыў шапку.

МОВА НАНОВА
ДЗЕТКАМ
БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Гімнастыка для вачэй. Каб было весялей, зрабіце да вершыкаў малюнкі!

Пад гэты вершык міргаем вочкамі, нібыта матылёк махае крылцамі. На слове “прыселі” моцна заплюшчваемся.

Вочкі, вочкі-матылёчкі,
Паляцелі нашы вочкі,
Паляцелі-паляцелі
і на кветачку прыселі!

Вочы плаўна пераводзім угару і ўніз.

Толькі сеў я на арэлі,
Як арэлі паляцелі!
Моцна я трымаюся,
Уверх ды ўніз гайдаюся!
І спяваю, і смяюся –
Анічога не баюся!

Вочы пераводзім справа налева, злева направа, плаўна, стараемся ўбачыць сваё вуха

Ёсць у слоніка два вухі,
на адно з іх села муха.
- Дзе ты, муха, дзе ты, дзе? –
муха знай сабе гудзе.
Трэба муху адшукаць
і ад вуха адагнаць!

Малюем вачыма банцік у адзін, потым у іншы бок.

Павучок цэлы дзень сетку новую пляце.
Столь – парог – акно – сцяна -
ад відна і да відна.
Так ён завіхаецца, рупіцца, стараецца,
А пабачыць гаспадыня – паскідае павуцінне!

Малюем вачыма хвалю знізу да верху ў адзін, потым у іншы бок.



Вось так, вось так па сцяне паўзе чарвяк.
Вось так, вось так па сцяне ўзлез чарвяк.



Малюем вачыма хвалю ў кірунку справа налева ў адзін,потым у іншы бок.

Улева-ўправа, улева-ўправа –
Спрытна сноўдае чаўнок.
Спрытна сноўдае чаўнок –
Тчэ малому дыванок.

Апісваем вачыма вялікае кола спачатку ў адзін, тады ў другі бок, спачатку вертыкальнае, потым – гарызантальнае.

Наш гадзіннік прытаміўся,
Прыпазніўся ды спыніўся.
Раптам стрэлка – скок ды скок –
Паскакала ў іншы бок.
Тата наш гадзіннік зняў,
батарэйку памяняў.
Дык ужо каторы дзень
Добра, спраўна ён ідзе.

Апошні вершык – расслабленне. Каб расслабіць вочы і абвастрыць зрок, прыкладзіце далоні да вачніц так, каб вачам стала цёмна, пры гэтым пальцы скрыжаваныя на лбе. Уяўляйце сабе чорны колер – як фон ці як нейкую чорную рэч. Не напружвайце вочы! Расслабіўшы іх, вы пабачыце чорны фон.

Чорны-чорны-чорны дзень. Неба чорнае, бы цень,
А на небе тым высокім танчаць чорныя аблокі.
Вось з-пад чорных з-пад варот
Вылез чорны-чорны кот.
Гэты чорны-чорны кот сеў на чорны-чорны плот.
Ліжа чорным языком міску з чорным малаком!

МОВА НАНОВА
ДЗЕТКАМ
БЯСПЛАТНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ